АКЦЫІ




# ТОБОЙ ГОРЖУСЬ Я, БЕЛАРУСЬ!

Сёлета спаўняецца 35 гадоў незалежнасці Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі далучаецца да тэматычнай інфармацыйнай акцыі «Тобой горжусь я, Беларусь!». У межах акцыі нашы сябры і калегі, сучасныя пісьменнікі Прынёманскага краю разважаюць пра тое, што для іх незалежнасць нашай сінявокай Радзімы.



**Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко, паэт Браніслаў ЕРМАШКЕВІЧ:**

Пацвярджэнне правільнасці абранага шляху мы бачым ужо шмат гадоў. Кожны год 3-га ліпеня ўся Беларусь з размахам адзначае Дзень Незалежнасці. Незалежнасць наша непасрэдна звязана з вызваленнем роднага краю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, з імкненнем да міру. Што і атрымала адлюстраванне ў даце свята. Людзі ведаюць і разумеюць яго каштоўнасць. Ведаюць цану, якую нашы продкі заплацілі за тое, каб мы зараз жылі ў сваёй краіне пад мірным небам.

На гэтую тэму я разважаю ў сваім вершы:

***

Над Радзімай праменнае сонца ўзышло,
Запаліла агні незалежнасці:
Шлях у будучыню азарае святло,
Сімвал веры нас кліча да еднасці.

Не змарнеюць у еднасці нашы гады –
Родны край асвятліцца дзяннніцамі.
Будзе нам ад нягод абярэгам заўжды
Ясны дзень, што ўстае над крыніцамі.

Ёсць бацькоўскі наказ: бараніць ад бяды.
Радаводам сваім люд наш славіцца.
Не забыць ад сівога-былога сляды
І да новага з годнасцю ставіцца.

З нараджэння ў нас продкаў жыве запавет:
Даражыце свабоднай Радзімаю,
А калі на падмогу яна пазаве,
Грамадою мы пойдзем адзінаю!

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

Ліпень, 2026